Адукацыя і выхаванне
выдавецтва

*Серыя «У дапамогу педагогу»*
*заснавана ў 1995 годзе па ініцыятыве У. П. Пархоменкі*

Навукова-метадычны часопіс
Выдаецца з I квартала 1997 года
Рэгістрацыйны № 842
Выходзіць 6 разоў у год

# ГІСТОРЫЯ
## ПРАБЛЕМЫ ВЫКЛАДАННЯ

**№ 6 (36) • 2004**

**Заснавальнік і выдавец**
**Установа «Выдавецтва**
**„Адукацыя і выхаванне“»**

220004, г. Мінск,
вул. Караля, 16;
тэл.: 200-02-28 (адк. сакратар),
200-10-73 (аддзел маркетынгу),
факс: 200-54-10
e-mail: aiv@aiv.by
http: //www.aiv.by

**Рэдакцыйная калегія**

*Галоўны рэдактар*
**М. І. Мініцкі**

*Першы намеснік галоўнага рэдактара*
**У. В. Тугай**

*Намеснік галоўнага рэдактара*
**Н. М. Ганушчанка**

*Адказны сакратар*
**Л. В. Саламаха**

*Члены рэдкалегіі*

**І. І. Багдановіч**
**М. М. Забаўскі**
**В. А. Капранава**
**Г. А. Космач**
**У. С. Кошалеў**
**С. В. Паноў**
**А. П. Сманцар**
**М. С. Сташкевіч**
**К. І. Сякацкая**
**В. М. Фамін**
**І. І. Цыркун**
**В. М. Шутава**
**М. М. Шэпель**
**А. А. Яноўскі**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Аляксандр Карзюк, настаўнік гісторыі гімназіі № 11 г. Мінска*

# ВЫВУЧЭННЕ ТЭМЫ «УТВАРЭННЕ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫІ» (8 клас)

### *Урок 1.* Умовы і асаблівасці ўтварэння беларускай нацыі (§ 17)

Магчымы два варыянты арганізацыі ўрока. Пры першым з іх урок камбінаваны. У яго першай частцы праводзіцца апытанне па папярэдняй тэме «Рабочы рух. Утварэнне сацыял-дэмакратычных арганізацый». Пры другім — вывучаецца новы матэрыял.

Задачы ўрока вызначаюцца светапоглядным зместам, звязаным з вывучэннем паняццяў **этнас, нацыя, нацыянальная самасвядомасць, нацыянальна-вызваленчы рух.** Таму на ўроку важна прааналізаваць прыкметы беларускай нацыі і ўмовы яе ўтварэння ў сярэдзіне XIX ст., вылучыўшы асаблівасці дадзенага працэсу.

З аднаго боку, урок патрабуе пэўнага ўзроўню развіцця лагічных уменняў вучняў, паняційна-тэрміналагічнага апарату, наяўнасці навыкаў аналізу, параўнання, ацэньвання гістарычных падзей і працэсаў; з другога — вядзе да іх удасканалення і далейшага развіцця. Правільная арганізацыя работы па вывучэнні гэтай тэмы будзе спрыяць выхаванню пачуццяў нацыянальнай годнасці, свядомасці, павагі і пашаны да беларускага народа, сваёй Радзімы.

У пачатку ўрока вывучаецца азначэнне і прыкметы нацыі. Разам з настаўнікам вучні складаюць і запісваюць у сшытку лагічную стужку «Этнічныя працэсы»:

Племя → Народнасць → Нацыя

Затым на падставе блок-схемы «Прыкметы нацыі» фармулюецца азначэнне гэтага паняцця:




Нацыя — вялікая, гістарычна складаўшаяся ўстойлівая супольнасць людзей, якая мае агульную тэрыторыю, мову, культуру, сістэму сацыяльна-эканамічных сувязей, традыцый і нацыянальную самасвядомасць. Настаўнік запісвае на дошцы ўмовы фарміравання нацыі:

1. Развіццё капіталізму.
2. Складванне агульнанацыянальнага рынку.
3. Фарміраванне класаў капіталістычнага грамадства.
4. Рост нацыянальнай самасвядомасці.

Затым ён прапануе вызначыць цяжкасці ў станаўленні беларускай нацыі і асаблівасці яе фарміравання праз аналіз наступных фактаў:

1. Гарады ў Беларусі ў XIX — пачатку XX ст. па складзе насельніцтва толькі ў нязначнай частцы былі беларускімі *(гл. дыяграму на с. 110 падручніка).*

2. У 1897 г. у Пецярбурзе жыло больш за 66 тыс. беларусаў, у Маскве — каля 16 тыс., у Мінску — каля 8, у Гродне — каля 5,4 тыс.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

3. У складзе гандлёва-прамысловай буржуазіі Беларусі было 84,5 % яўрэяў, 10,7 — рускіх, 1,7 % беларусаў.

4. Беларусы з даўніх часоў падзяляюцца на праваслаўных і каталікоў. Першыя ў 1897 г. складалі 81 % насельніцтва, каталікі — 19 %. У Віленскай губерні каталікі-беларусы складалі 60 %, у Магілёўскай — 2 % [4, с. 107].

На падставе аналізу і супастаўлення фактаў вучні прыходзяць да высноў аб цяжкасцях і асаблівасцях у фарміраванні беларускай нацыі і запаўняюць табліцу.

| Цяжкасці | Асаблівасці |
|---|---|
| 1. Існаванне беларускай нацыі і мовы не прызнавалася польскімі, а затым расійскімі ўладамі.<br>2. Прамысловая буржуазія і пралетарыят пераважна не былі беларускімі па нацыянальным складзе. | 1. Русіфікатарская палітыка царызму і паланізатарская дзейнасць польскіх паноў і касцёлаў.<br>2. Фарміраванне нацыі як сялянскай у сваёй аснове.<br>3. Адсутнасць нацыянальнай школы, друку, культурна-асветных устаноў.<br>4. Рэлігійны падзел беларускага насельніцтва. |

Вызначыўшы асноўныя заканамернасці фарміравання і развіцця беларускай нацыі, адбываецца пераход да характарыстыкі яе асобных прыкмет у сярэдзіне XIX ст. Затым настаўнік арганізуе вучэбна-пазнавальную работу вучняў з тэкстам § 17 падручніка ў чатырох мікрагрупах:

*1 мікрагрупа* — тэрыторыя і насельніцтва (п. 1).

*2 мікрагрупа* — гаспадарчае жыццё (п. 2).

*3 мікрагрупа* — мова (п. 3).

*4 мікрагрупа* — этнічная свядомасць і нацыянальна-вызваленчы рух (п. 4).

**Заданне:** на падставе вызначанага тэксту выпісаць станоўчыя рысы і здабыткі ў складванні дадзеных кампанентаў нацыі.

Пасля завяршэння работы і заслухоўвання прадстаўнікоў мікрагруп вучні разам з настаўнікам фармулююць выснову аб ходзе, значэнні і перашкодах на шляху да фарміравання беларускай нацыі.

На дом, акрамя § 17, можна прапанаваць апераджальнае заданне: падрыхтаваць паведамленні пра дзеячаў літаратуры і мастацтва другой паловы XIX ст. — Ф. Багушэвіча, Я. Лучыну, К. Каганца, А. Гараўскага, Н. Сілівановіча, К. Альхімовіча.

> Пасля вывучэння тэмы «Утварэнне беларускай нацыі» ў класах, дзе вучні праяўляюць схільнасць і цікавасць да вывучэння гісторыі, або на гуртковых і факультатыўных занятках можна правесці ўрок-роздум «Шлях да Беларусі», у якім мэтагодна выкарыстаць прыёмы драматызацыі і міжпрадметныя сувязі з беларускай літаратурай, што выкліча абуджэнне эмацыянальнага настрою і мысліцельных працэсаў школьнікаў і паспрыяе рэалізацыі мэты і задач вывучаемай тэмы. Ніжэй прапануем распрацоўку магчымага варыянта дадзенага ўрока.

## Урок 2. Шлях да Беларусі

Нягледзячы на тое, што гэта незвычайны ўрок, перад ім стаяць важныя задачы пашырэння, паглыблення і канкрэтызацыі ведаў вучняў аб этнічных працэсах на беларускіх землях, фарміраванні прыкмет беларускай нацыі, цяжкасцях і магчымых шляхах іх пераадолення. Выкарыстанне такой формы ўрока будзе спрыяць развіццю пазнавальнай самастойнасці і творчай актыўнасці вучняў, іх драматычных здольнасцей, культуры маўлення і мыслення, выхаванню нацыянальнай самасвядомасці, годнасці і гонару за гісторыю Радзімы, свой народ.

Пры правядзенні ўрока на яго розных этапах шырока выкарыстоўваюцца творы класічнай і сучаснай беларускай літаратуры: п'есы Янкі Купалы «Тутэйшыя», У. Караткевіча «Кастусь Каліноўскі», лірыка Янкі Купалы і Н. Гілевіча. Ва ўступным слове настаўнік знаёміць вучняў з тэмай і задачамі ўрока і запрашае іх да роздуму аб гістарычным лёсе Беларусі і беларускага народа.

Роздум адкрываецца вершам Н. Гілевіча «І ўсё-такі дойдзем!..».

За векам век плыве-цячэ,
А мы ідзем, ідзем... І што ж?
О, як далёка нам яшчэ
Да Беларусі!

Ужо няўсцерп нам крыж пакут,
І мы крычым, крычым, але —
Не дакрычаліся пакуль
Да Беларусі.

А можа быць, яна — міраж,
І ўсе мы трызнім? Бо чаму ж
Не далятае голас наш
Да Беларусі?

Відаць, пракляцця знак ляжыць
На нас ад роду, і таму
Так цяжка шлях нам церабіць
Да Беларусі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Падчас бадання тубыльцув, осядлых на Всходніх Крэсах польскіх, о розмярах замешкалэго пшэз ніх тэрыторыуму зостало высветлёным, іж данэ тэрыторыум вхланя в себе цалкем провінцыен Мінскей Брэхалкі і ешчэ далей... На запытане, як сень далеко распостшэня овэ «далей», муй інформатор походзонцы од бялорусінув ожэкл в огульнопольскім мейсцовым нажэчу, іж для осёнгненця онэго «далей» наука наогул, а в шчэгульносці наука Всходня посяда за крутке пенты.

**Заходні вучоны** (*да Янкі*). Бардзо на часе, жэ пан обэцным ест. Для взбогацэня нашэй ведзы польскей потшэбнэ сон ешчэ нектурэ шчэгулы о нібы вашым краю. Можэ, шановны пан поінформуе цось о пшыродзе так званэй по-вашэму Бялэй Русі і цось о тэм, яке собе закрэсляце граніцэ політычнэ.

**Янка.** Прырода наша, пане вучоныя, прыродная. Маем поле і лес, горы і даліны, рэчкі і вазёры, нават мора мелі — называлася Пінскае, — але акупанты змяшалі яго з гразёй, дык засталося толькі Пінскае балота. А граніц палітычных не маем, бо і палітыкі сваёй не маем — на чужой палітыцы пакуль што ездзім.

**Усходні вучоны** (*запісваючы ў нататнік*). Прырода в Русском Северо-Западном крае веліка і обільна — есть суша і водныя басейны, дажэ морэ собственное імелось, но благодаря врэдным клімацічэскім веяніям с Запада поіменованное морэ утонуло в Пінском болоце. Что касается політічэскіх граніц обласці, то оне в прэдставленіі здзешніх общэрускіх людей очень туманны. Всё жэ прымечается стрэмленіе расшырыць эці граніцы на Запад.

**Заходні вучоны** (*запісваючы ўперамежку з Усходнім*). Пшырода на Польскіх Крэсах Всходніх надзвычай буйна і богата; эгзыстуе лёнд і водозбёры; край тэн посядал навэт можэ, але, завдзенчаёнц шкодлівым вплывом зэ Всходу, можэтэ пшэісточыло сень в Пінске блото. Цо сень тычы граніц політычных краю, то взглендэм іх у месцовэй людносці вшэхпольскей пшэдставене бардзо не яснэ. Еднак, спостшэга сень донжэне розшэжыць овэ граніцэ на Всхуд.

**Усходні вучоны.** Ешчо одзін маленькій вопрос: вашы землякі не собіраются в будушчэм прыобрэсці себе морэ вместо утонувшего, чтобы со временем пробіць себе куда-нібудзь окошко — в Европу ілі Азію?

**Янка.** Нам і без мора, пане вучоны, хапае дзе тапіцца, як павее пошасцяй праз усходнія ці заходнія «акошкі».

**Усходні вучоны** (*запісваючы*). О Дарданелах, о Індзійскіх морях і о какіх-лібо окошках не помышляют і помышляць не жэлают, ібо, по іх жэ словам, і без того імеют гдзе топіться, когда повеет сквознякамі із Запада.

**Заходні вучоны** (*запісваючы ўперамежку з Усходнім*). О розшэжэню своіх граніц од можа до можа не мажон і мажыць собе не жычон, поневаж, як самі твердзон, маён гдзе топіць сень і бэз можа, гды повеён пшэцёнгі зэ Всходу.

**Усходні вучоны** (*скончыўшы пісаць*). Благодару вас!

**Заходні вучоны** (*скончыўшы пісаць*). Дзенькуен пану!

*Вучоныя кланяюцца і выходзяць кожны ў супрацьлеглыя бакі* [3, с. 368–373].

Пасля заканчэння інсцэніроўкі вучні і настаўнік абмяркоўваюць убачанае. Часцей за ўсё школьнікі не могуць правільна вызначыць час, калі адбываецца падзеі ў пастаноўцы (бо яны яшчэ не вывучалі гэты перыяд ні па гісторыі Беларусі, ні па беларускай літаратуры), і таму звычайна называюць XIX стагоддзе.

Папраўляючы іх і паведамляючы, што дзея адбываецца ў 1918 г., настаўнік пытаецца, чаму словы п'есы, тым не менш, гучаць актуальна і для XIX ст. Адказваючы на пытанне, вучні прыходзяць да высновы, што прычынай гэтага з'яўляецца працяглае апалячванне і русіфікацыя беларускага этнасу, што значна ўскладніла фарміраванне беларускай нацыі.

Пасля гэтага настаўнік падкрэслівае, што таму надзвычай важным з'яўляецца пытанне фарміравання нацыянальнай самасвядомасці беларусаў і прапануе абмеркаваць ролю асобы ў гістарычным мінулым Беларусі.

Ён паведамляе, што, нягледзячы на тое, што Беларусь доўгі час не была самастойнай, заўсёды знаходзіліся людзі, якія змагаліся за яе Адраджэнне, як і галоўны герой п'есы — Янка Здольнік. Але часта іх лёс складваўся трагічна — Ф. Скарына памёр на чужыне, скончыўшы свае дні садоўнікам; Т. Касцюшка і А. Міцкевіч сталі выгнаннікамі, К. Каліноўскага чакала шыбеніца, М. Багдановіч згас ад туберкулёзу, трагедыяй для маладой беларускай інтэлігенцыі сталі гады сталінскіх рэпрэсій...

Але заўсёды знаходзіліся людзі, што пераймалі паходню беларускасці, дзякуючы чаму яна ніколі не затухала. Чаму? Настаўнік прапануе паслухаць адказ, які У. Караткевіч даў вуснамі Кастуся Каліноўскага ў размове з графам Мураўёвым у ноч перад пакараннем смерцю. (У выпадку, калі ў класе ёсць вучні, здольныя пераканаўча і эмацыянаљ-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

на выканаць гэтую сцэну, яе можна прадставіць у выглядзе інсцэніроўкі; у адваротным выпадку ўрывак лепш выразна прачытаць самому настаўніку.

**Мураўёў.** Ці думалі вы, супраць чаго паўстаеце? Ці думалі, што тысячу год кожны разбіваў аб нас галаву? Былі бунты, рэвалюцыі — а мы заставаліся, і зноў аб нас разбівалі галаву. Таму што мы — парадак, дзяржава, таму што за нас вера, забабоны, філасофія, культура. Таму, што за нас — жах. Людзі не могуць жыць свабоднымі сярод руін. Яны ўзрываюць дом, кідаюцца трошкі сярод камення са сваімі добрымі намерамі, а потым будуюць новы, яшчэ горшы. І кожны раз льецца кроў. І гінуць лепшыя, а не горшыя. І пасля кожнага такога эксперыменту сярод жывых застаецца больш і больш мярзотнікаў.

**Кастусь.** Я думаў над гэтым. Чаго вы хочаце?

**Мураўёў.** Бачыш муры? Ты можаш з іх выйсці. Зараз. Я хачу гэтага. Ведаеш, каб людзі жылі, трэба, каб лепшыя з лепшых не бунтавалі, а ішлі да паборнікаў парадку і магутнасці айчыны... Я абяцаю вам словам двараніна волю і месца пры мне... Я вам абяцаю. Не Аляксандр — я.

**Кастусь.** Гэта важыць больш. Ведаю... Чаму прапаноўваеце?

**Мураўёў.** Хачу, каб вы сталі членам дзяржаўнага савета ў пяцьдзесят год.

**Кастусь.** У дваццаць пяць я быў вярхоўны ваявода Беларусі і Літвы.

**Мураўёў.** А ў дваццаць пяць можаш не быць нікім.

**Кастусь.** Ведаю.

**Мураўёў.** А паслухаеш — можаш жыць, кахаць...

**Кастусь.** Калі за вас парадак, то чаму сярод вас столькі нягоднікаў? Чаму з пакалення ў пакаленне лепшае — гіне, а ўсё адно ідзе да нас, да «сволачы»?

*Паўза.*

Я вам скажу, чаму. Кожны раз чалавецтва бліжэй да шчасця... на вышыню нашых магіл. З крывёю, са стогнамі на дно прорвы, яно, здыхаючы, паўзе да праўды... [2].

У канцы ўрока адбываецца падагульняючая дыскусія.

1. Чаму так трагічна складваўся гістарычны лёс Беларусі?
2. Ці канчаткова, на ваш погляд, сфарміравалася беларуская нацыя? Чаму?
3. Ці захаваюцца Беларусь і беларусы ў XXI стагоддзі?

Урок завяршаецца вершам-заклікам Янкі Купалы «Моладзі».

На цябе, наша моладзь, надзея
Нашай сумнай забранай зямлі;
Твой арліны палёт цьмы развее
І запаліць веквечны агні.

Ты разбудзіш прыспаныя сілы
І на вольны палічаны прастор
З забыцця беспрасветнай магілы
Да бліскучага сонца, да зор.

Ты на бацькаўскім, моладзь, кургане
Узнясеш нездабыты пасад,
Што расточыць сваё панаванне
На ўвесь край, дзе сягне твой пагляд.

Табе будуць не страшны заломы,
Злыя ворагі, іх варажба:
Долю, праўду з маланак і громаў
Твае выкрасяць гарт, барацьба.

Схамянайся ж ты, моладзь арліна!
Ў бок другі віхры веяць прымусь,
Бяры светач, ідзі за судзьбінай,
Ідзі з словам святым: Беларусь!

[3, с. 256].

Асноўная падрыхтоўка да правядзення ўрока такога тыпу заключаецца ў арганізацыі інсцэніровак па адным або двух прапануемых драматычных творах, падрыхтоўцы касцюмаў, а таксама вучняў-чытачоў, якія будуць дэкламаваць у пачатку і ў канцы ўрока вершы на памяць.


1. *Гілевіч Н.* Незалежнасць. — Мн., 1991.
2. *Караткевіч У.* Кастусь Каліноўскі / Зб. тв.: У 8 т. — Т. 8. Кн. 1. — Мн., 1990.
3. *Купала Я.* Жыве Беларусь. — Мн., 1993.
4. *Шарова Н. С.* і інш. Тэставыя заданні па гісторыі Беларусі. — Мн., 2002.